# ДЗЕЛЯ ГАЛОЎНЫХ КАШТОЎНАСЦЯЎ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што міратворчая місія Беларусі па ўрэгуляванні сітуацыі ва Украіне вядомая. «Ад яе нікуды не дзенешся. Мы браты — рускія, беларусы, украінцы, мы ад аднаго кораня. Нам балюча, калі адбываецца бяда ў нашых братоў, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Мы будзем усё рабіць для таго, каб неяк змякчыць сітуацыю, а калі магчыма, і спыніць гэтую братазабойчую вайну».

Прэзідэнт выказаў падзяку патрыярху Кірылу за ўсё, што ён робіць для Беларусі. У краіне ўсе выдатна ведаюць падзвіжніцкую ролю патрыярха, яго стаўленне да краіны. Паводле яго слоў, патрыярх Кірыл неаднаразова бываў у нашай краіне і мог на свае вочы пераканацца, наколькі адданыя беларусы духоўным караням і каштоўнасцям.

Патрыярх Кірыл у сваю чаргу падзякаваў Беларусі за ролю ў арганізацыі перамоў па ўрэгуляванні сітуацыі ва Украіне. Па словах настаяцеля РПЦ, тое, што адбываецца цяпер ва Украіне, брацкай краіне, з'яўляецца для яго вялікім жалем. «Гэта сапраўды рана на сэрцы, — сказаў патрыярх. — Праваслаўная кананічная царква мае ў сваёй пастве людзей як з усходу, так і з захаду. Гэта накладвае зусім асаблівую адказнасць на царкву».

«Сёння наша царква з'яўляецца адзінай арганізацыяй ва Украіне і адзінай сілай, якая захавала міратворчы патэнцыял, таму што яна сябе не атаясамляе ні з аднымі, ні з другімі», — падкрэсліў Патрыярх Кірыл. Ён заявіў, што немагчыма падзяліць паству па палітычным прынцыпе: «І там, і там праваслаўныя людзі; і там, і там пакутуюць, гінуць».

Настаяцель РПЦ расказаў, што асабліва хацеў наведаць Беларусь у год 70-годдзя Перамогі. Ён адзначыў, што кожны раз, калі наведвае краіну, адчувае цёплыя і радасныя пачуцці. «Але, акрамя таго, ступаючы на беларускую зямлю, заўсёды ўспамінаеш асаблівы ўклад Беларусі ў абарону Айчыны ў апошняй вялікай вайне», — сказаў патрыярх Кірыл.

Патрыярх падзякаваў за магчымасць наведаць Брэсцкую крэпасць, ля сцен якой загінуў яго дзядзька. «Гэта святое месца з'яўляецца ўзорам гераізму, адвагі, здольнасці людзей не проста да канца сваіх фізічных сіл, а звыш усялякіх фізічных магчымасцяў змагацца з ворагам і быць верным прысязе», — сказаў ён.

Падчас сустрэчы Патрыярх Кірыл уручыў Прэзідэнту Беларусі ордэн прападобнага Серафіма Сароўскага I ступені, а таксама перадаў у дар абраз святога роўнаапостальнага князя Уладзіміра, паведамляе прэс-служба кіраўніка дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка падараваў патрыярху ікону «Анёл-ахоўнік». Яна ўяўляе сабой рэльефную выяву анёла, выробленую з серабра ў тэхніцы чаканкі. Акрамя таго, кіраўнік дзяржавы правёў для патрыярха кароткую экскурсію па залах Палаца незалежнасці, дзе праходзіла сустрэча.

# БЛАСЛАВЕННЕ АД ПАТРЫЯРХА

**Прадстаяцель Рускай Праваслаўнай Царквы прыляцеў у аэрапорт «Мінск» з добрым настроем. Па яго словах, так адбываецца штораз. «Наведванне Беларусі, якая з'яўляецца каштоўным каменем у кароне праваслаўных хрысціянскіх народаў, для мяне вельмі важнае і па-чалавечы радаснае», — падзяліўся ўладыка.**



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Далей патрыярха чакалі на Плошчы Перамогі, дзе ён усклаў вянок да абеліска і звярнуўся да прысутных з прамовай, у якой благаславіў беларускую зямлю: «Успамінаючы ўсіх, хто загінуў у час вайны, мы адначасова просім Госпада, каб Ён дараваў мір Беларусі, Расіі, Украіне і ўсім братэрскім краінам, якія, жывучы ў адзінай дзяржаве, прынеслі свету Вялікую Перамогу і вызваленне ад страшнага ворага. Няхай благаславенне Божае жыве над горадам Мінскам і над беларускай зямлёй».

## ЧАС ДЛЯ МАЛІТВЫ



Асноўная частка мінскага дня візіту адбылася ў Свята-Духавым кафедральным саборы, дзе патрыярх правіў набажэнства. Унутр храма ўмясціліся не ўсе, і таму большая частка (некалькі тысяч) вернікаў запоўніла ўзгорыстую ваколіцу. Для іх былі усталяваны на вуліцы экран. Нягледзячы на пахмурнае і даволі ветранае надвор'е, большасць прысутных адстаялі да канца набажэнства. З храма вялася і прамая трансляцыя для прыхільнікаў назіраць за службай з экранаў тэлевізараў.

Напрыканцы набажэнства іерархі сказалі пропаведзь. Пачаў яе Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Павел, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі: «Мы будзем успамінаць самыя страшныя дні пачатку вайны. Прайшло 74 гады, але памяць пра гэта захоўваецца ў сэрцах і свядомасці ўсіх жыхароў Беларусі. Ён таксама звярнуў увагу на святкаванне 1000-годдзя спачыну святога роўнаапостальнага князя Уладзіміра. «Мы кажам, што гэта свята, таму што ў Бога няма мёртвых, у Бога ўсе жывыя», — растлумачыў кіраўнік БПЦ і ўручыў патрыярху абраз святога Кірыла, епіскапа Тураўскага, а таксама архірэйскае адзенне.

«Калі паўстала пытанне пра тое, каб патрыярх узначаліў урачыстасці ў сталіцы Беларусі, мне падалося, што зручней за ўсё гэта зрабіць у дзень, калі мы ўспамінаем усіх беларускіх святых», — патлумачыў Святейшы. У сваёй прамове ён закрануў усё тыя ж тэмы-нагоды да свайго прыезду: 70-я гадавіна Перамогі, святкаванне памяці Сабора беларускіх святых і 1000-годдзе спачыну хрысціцеля Русі. Кажучы пра князя Уладзіміра, уладыка падкрэсліў, што той «аб'ядпаў раз'яднаныя славянскія плямёны не толькі сілай дзяржаўнай улады», але і агульнай духоўнасцю. Бо другое дапамагае трымаць адзінства на вялікай геаграфічнай прасторы нічым іншым не аб'яднаных людзей.

## ПУНКТ ЗБОРУ ДЛЯ РАЗВІЦЦЯ ДУХОЎНАСЦІ

Пасля асвячэння Духоўна-адукацыйнага цэнтра Беларускай Праваслаўнай Царквы, у стварэнні якога ўдзельнічалі дзяржава і Прэзідэнт, адбылося гашэнне маркі з нагоды 1000-годдзя спачыну святога роўнаапостальнага князя Уладзіміра. Яго ў тры рукі зрабілі Святейшы Патрыярх Маскоўскі і ўсяе Русі Кірыл, Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Павел і віцэ-прэм'ер Беларусі Наталля Качанава.

У адным з пакояў Духоўна-адукацыйнага цэнтра прайшла сустрэча з беларускімі лаўрэатамі міжнароднага грантавага конкурсу «Праваслаўная ініцыятыва». Адна з мінулых пераможцаў Вера Сярдзюк, кіраўнік Цэнтра падтрымкі сям'і і мацярынства «Матуля», расказала, што дзякуючы праграме здзейснілася адна з яе задум. Сёлета ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі паступіў законапраект, згодна з якім кожная жанчына, якая вырашыла зрабіць аборт, мае права на псіхалагічную кансультацыю ад установы аховы здароўя, а доктар можа адмовіцца ад гэтай аперацыі. У сваю чаргу Патрыярх расказаў, што ў Расіі для змагання з абортамі створаны пры праваслаўных цэнтрах прытулкі для жанчын, якія вырашылі пакінуць дзіця, а не пазбавіцца ад яго. Такім чынам было выратавана болей за 15 тысяч новых жыццяў.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**
*pustavit@zviazda.by*

Напрыканцы прадстаяцель асвяціў скульптурную кампазіцыю ў памяць аб з'яўленні абраза Багародзіцы на рацэ Свіслач у 1500 годзе. Калісьці святы роўнаапостальны князь Уладзімір перанёс ікону з Херсанеса ў Кіеў, адкуль яна знікла і была зноў знойдзена ў сучаснай беларускай сталіцы. Таму яе часцей за ўсё клічуць «Мінскай». Сама скульптура сімвалізуе рачную плынь, напрыканцы якой ладдзя ў форме птушкі, а ў ёй — сам абраз.



# СІМВАЛ АДЗІНСТВА І ПЕРААДОЛЕННЯ

## Прадстаяцель Рускай Праваслаўнай Царквы ў Дзень усенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны маліўся ў Брэсце

**Візіт прадстаяцеля Рускай Праваслаўнай Царквы ў Брэст пачаўся раніцай у нядзелю. У Свята-Уваскрасенскім саборы ўладыку чакалі многія тысячы вернікаў. Храм змог змясціць крыху больш за дзве тысячы чалавек. Астатнія глядзелі прамую трансляцыю са службы на загадзя змантаваных экранах.**

Патрыярх правёў Боскую літургію ў дзень свята Сабора Беларускіх святых — такіх, як Еўфрасіння Полацкая, Кірыл Тураўскі, Сімяон Полацкі і іншыя. Яшчэ малітва была ўзнесена ў гонар роўнаапостальнага князя Уладзіміра, хрысціцеля Русі, бо 21 чэрвеня праваслаўная царква адзначала 1000-годдзе з дня ўпакаення гэтага святога. Дарэчы, Патрыярх Маскоўскі і ўсяе Русі прывёз у Брэст каўчэг з часцінкай мошчаў святога князя Уладзіміра. Мошчы прабудуць у саборы яшчэ два дні.

Звяртаючыся да вернікаў Патрыярх Кірыл сказаў: «Мы знаходзімся на самым заходнім памежжы Русі, якую летапісцы назвалі Святой Руссю. І называлі так не таму, што нашы людзі былі свяцейшымі за іншых. Святасць была нашым агульным нацыянальным ідэалам... І сёння гэты вялікі ідэал, зязючы прыгажосцю, прыцягвае разумных людзей, здольных мысліць і адрозніваць дабро ад зла». Менавіта ў імкненні да ідэала заключаецца сіла і непераможнасць народа», — лічыць Кірыл.

Закрануў у сваім пастырскім слове ўладыка і тэму Вялікай Айчыннай вайны. Сказаў, што перамога над фашызмам стала найвялікшым адраджэннем праваслаўнай веры, якая перажыла найцяжэйшыя часы, звязаныя з закрыццём цэркваў, разбурэннем манастыроў, расстрэламі і ссылкамі святароў. «У акопах на перадавой не было няверуючых», — заўважыў ён.

Не было іх і ў Брэсцкай крэпасці, якая першай на сабе адчула націск ворага. Менавіта сюды ўжо шмат гадоў прыходзяць брастаўчане, каб перад світаннем ушанаваць памяць продкаў, якія загінулі, зрабіўшы першы крок да Перамогі.

На гэты раз мерапрыемствы пачаліся не ў чатыры раніцы, а ў дзве гадзіны. Рэканструктары паказалі прысутным эпізоды апошняга мірнага вечара ў цытадэлі. На плошчы сабраліся ветэраны, кіраўнікі горада і вобласці, удзельнікі маштабнай рэканструкцыі падзей першага дня вайны, сотні гараджан. Сярод ветэранаў быў Пётр Паўлавіч КАЦЕЛЬНІКАЎ, выхаванец узвода музыкантаў, які 12-гадовым хлопчыкам сустрэў той страшны дзень.

— Апошнія гады я жыву ў Мінску ў дзяцей, але на гэтае мерапрыемства не мог не прыехаць, — сказаў Пётр Паўлавіч. — Успаміны аб вайне будуць са мной да апошняга майго дня.

...Як заўсёды, былі шчымлівыя ціхімі апошнія гадзіны перад світаннем, калі яшчэ не пяюць птушкі, і нават чуваць, як цячэ вада ў Бугу. Як заўсёды, паплылі па Бугу жалобныя вянкі, якія спусцілі на ваду вайскоўцы. Як заўсёды, прайшлі па плошчы Цырымоніяльнай жанчыны ў белым адзенні са свечкамі ў руках. Мітынг-рэквіем пачаўся па традыцыі а чацвёртай гадзіне раніцы. Яго адкрыў старшыня Брэсцкага аблвыканкама Анатоль ЛІС:

— Мы смуткуем аб мільёнах воінаў, чые жыцці абарвалі варожыя кулі. Мы смуткуем аб сотнях тысяч дзяцей, жанчын, старых, якія загінулі ў канцэнтрацыйных лагерах і памерлі ад голаду. Мы смуткуем аб тых, хто на сваіх плячах вынес перамогу, але пазней памёр ад ран і хвароб. Памяць пра іх, а таксама пра герояў, якія здабылі перамогу, з'яўляецца ўсенароднай, не мае нацыянальнасцяў і межаў, — падкрэсліў губернатар.

Святейшы Патрыярх Кірыл, які да мітынгу адслужыў памінальную літыю ў Мікалаеўскім гарнізонным храме Брэсцкай крэпасці, прыняў удзел у жалобных мерапрыемствах.



Фота Валерыя КАРАЛЯ.

У музеі крэпасці.

Яшчэ раней, у Мінску, прадстаяцель заўважыў, што Брэсцкая крэпасць — месца асаблівае для яго сям'і. Тут загінуў яго родны дзядзька. А на мітынгу ён сказаў:

— Мы з вамі адзіная сям'я. І не толькі таму, што ў нас цячэ кроў, якая ўзыходзіць да нашых продкаў, але і таму, што мы пражылі адну гісторыю і радасці, і смутку. Як падзяліць гэту гісторыю? Як падзяліць крэпасць Брэсцкую? Ёсць рэчы непадзельныя, як непадзельная ў ідэале чалавечая сям'я. Гераічная абарона Брэсцкай крэпасці з'яўляецца для нас сімвалам адзінства, вобразам адзінства, здольнасці сумесна пераадольваць смяротную небяспеку і перамагаць.

На памяць аб сваім наведванні крэпасці Святейшы Патрыярх перадаў мемарыяльнаму комплексу абраз Божай Маці «Усіх смуткуючых Радасць». А пасля цырымоніі ўладыка наведаў музей Брэсцкай крэпасці-героя, азнаёміўся з экспазіцыяй, пакінуў запіс у Кнізе ганаровых гасцей.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*yackevich@zviazda.by*